***А. М. Мельнікава***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Максім Гарэцкі (1893–1938) – класік беларускай літаратуры. Як мы ведаем, статус класічных, агульнапрызнаных нацыянальнай супольнасцю, атрымліваюць тыя творы мастацкай літаратуры, у якіх асэнсоўваюцца важныя для нацыі праблемы. Адпаведна, творы пісьменнікаў-класікаў не губляюць сваёй актуальнасці, кожнае наступнае пакаленне звяртаецца да іх у пошуках адказу на важнейшыя пытанні часу.

У сярэдняй школе вучні знаёмяцца з акалічнасцямі жыццёвага шляху М. Гарэцкага, вывучаюць апавяданні “Роднае карэнне”, “Літоўскі хутарок” (базавы ўзровень). Пры вывучэнні беларускай літаратуры на павышаным узроўні дадаецца аповесць “Дзве душы”. Гэтыя творы рэпрэзентатыўныя для творчасці пісьменніка. У іх гучаць праблемы, якія хвалявалі пісьменніка на працягу ўсёй яго творчасці.

На нашу думку, пры выкладанні творчасці М. Гарэцкага настаўніку абавязкова неабходна ўказаць на маштабнасць асобы пісьменніка. За М. Гарэцкім справядліва замацавалася азначэнне “тытан нацыянальнага адраджэння”. М. Гарэцкі пакінуў значны след не толькі як літаратар, але і як вучоны, публіцыст, грамадскі дзеяч, арганізатар навукі ў Беларусі. Таксама мэтазгодна звярнуць увагу вучняў на тое, што творы М. Гарэцкага знаходзяцца на адным узроўні з найлепшымі творамі еўрапейскай літаратуры. Аповесць “На імперыялістычнай вайне” выдатна прачытваецца ў кантэксце твораў так званага страчанага пакалення (Э. Рэмарк, Э. Хэмінгуэй, Дж. Дос Пасас, У. Фолкнер, Р. Олдынгтан), якім сусветнае мастацтва слова абавязана істотным прарывам у пераасэнсаванні тэмы “чалавек і вайна”. З імёнамі гэтых аўтараў звязаны істотныя змены ў падыходзе да адлюстраванні ваенных падзей. У іх творах вайна была пазбаўлена гераічнага пафасу.

Пры выучэнні апавядання “Літоўскі хутарок” варта

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адзначыць, што М. Гарэцкі прымаў непасрэдны удзел у Першай сусветнай вайне, бачыў усе яе жахі, быў цяжка паранены. М. Гарэцкі – аўтар самай вялікай у беларускай літаратуры колькасці твораў, прысвечаных той вайне: аповесці “На імперыялістычнай вайне”, “Ціхая плынь”, п’еса “Жартаўлівы Пісарэвіч”, апавяданні “Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “Генерал”, “На этапе”, “Пакінутыя хаты”, “Палонны”. Гэтыя творы, іх выразны антываенны пафас цалкам адпавядаюць пафасу твораў пісьменнікаў “страчанага пакалення”. М. Гарэцкі паказвае сапраўдную сутнасць вайны: кроў, забойствы, марадзёрства, скалечаныя лёсы. Галоўнаму герою аповесці “На імперыялістычнай вайне” Лявону Задуму, альтэр-эга аўтара, давялося пазнаць усе жахі вайны.

У апавяданні “Рускі” М. Гарэцкі пераканаўча дэманстуре, да якіх маральных страт прыводзіць вайна. Салдат-беларус, герой твора, падпаўшы пад прапаганду “ура-патрыятызму”, забівае такога ж гаротніка, як сам, селяніна-ўкраінца, салдата германскай арміі. Як вынік – герой страчвае розум. У гэтым творы М. Гарэцкі таксама асэнсоўвае тэму лёсу прадстаўнікоў так званых “малых” нацый, якія ўцягнуты ў крывавае ваеннае супрацьстаянне не па сваёй волі і гінуць за чужыя інтарэсы. У сваёй публіцыстыцы і крытычных артыкулах М. Гарэцкі не аднойчы звяртаўся да гэтай праблемы. У п’есе “Жартаўлівы Пісарэвіч” М. Гарэцкім па-мастацку пераканаўча перадае жах бежанства, лёс тых беларусаў-выгнаннікаў, якія вымушаны былі пакінуць свае хаты і якія тысячамі гінулі ў чужых краях.

Пры выкладанні аповесці “Дзве душы” неабходна звярнуць увагу на тое, што гэта сацыяльна-філасофскі твор. Сацыяльны аспект рэалізуецца праз узнаўленне грамадска-палітычнай сітуацыі часоў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, адлюстраванні руху нацыянальнага адраджэння. Філасофскі – праз роздумы пра ролю інтэлігенцыі як носьбіта маральна-этычных каштоўнасцей і абаронцы нацыянальных інтарэсаў. Пісьменнік адстойвае права чалавека на ўласную думку і погляды. У творы паказаны няпросты лёс змагароў за нацыянальнае адраджэнне.

Студэнты павінны засвоіць наступныя аспекты творчасці пісьменніка:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1) М. Гарэцкі – пісьменнік, які істотна ўзмацніў філасофскае гучанне беларускай прозы, яго творчасць адыграла вялікую ролю ў станаўленні жанру філасофскай прозы (аповесці "У чым яго крыўда?", "Роднае карэнне", "Меланхолія", "Дзве душы");

2) паглыбленне псіхалагізму (выяўленне духоўных пошукаў герояў, узнаўленне ўнутранага свету, апісанне работы свядомасці, падсвядомых імпульсаў);

3) жанравае і стылёвае ўзбагачэнне беларускай літаратуры: М. Гарэцкі – заснавальнік жанру філасофскай прозы, эпічнай драмы ("Антон"), дакументальна-мастацкай прозы ("На імперыялістычнай вайне");

4) творы М. Гарэцкага выдатна прачытваюцца ў еўрапейскім кантэксце;

5) у творчасці М. Гарэцкага адчувальныя мадэрнісцкія матывы;

6) М. Гарэцкі адным з першых паставіў пытанне пра сутнасць нацыянальнага светапогляду ("Дзве душы", цыкл "Патаёмнае, "Антон" і інш). У творах М. Гарэцкага глыбока і дакладна выяўлены свет жыцця беларусаў, пададзены абагулены вобраз беларускага народа, кодэкс нацыянальнай этыкі (аповесці "Ціхая плынь", "Дзве душы", "Камароўская хроніка", "На імперыялістычнай вайне", п'есы "Жартаўлівы Пісарэвіч", "Чырвоныя ружы"). М. Гарэцкі спрабуе асэнсаваць тое іманентнае, што ўласціва беларусам. Героі пісьменніка паўстаюць як носьбіты нацыянальнай псіхалогіі і свядомасці.

Цікавасць беларусаў да "патаемнага" празаік ацэньваў не як сведчанне забабоннасці, а як праяву духоўнасці, сведчанне паэтычнасці і маляўнічасці светабачання. Беларуса М. Гарэцкі называў "Філосафам" і "Лірнікам", "паэтам у душы", "арыстакратам духу". М. Гарэцкі падкрэслівае суіснаванне ў нацыянальнай свядомасці хрысціянскага і паганскага светабачання.

У аповесці "Камароўская хроніка", якую пісьменнік называў "памінальцай душы", М. Гарэцкі падае гісторыю сялянскага роду Задумаў (Батураў). Лёс асобнага чалавека разглядаецца пісьменнікам праз прызму гістарычнага лёсу народа, як духоўная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пераемнасць пакаленняў. Быццё нацыі асэнсоўваецца на вялікім гістарычным адрэзку часу – ад адмены прыгону да 1930-х гадоў.

У сваіх творах М. Гарэцкі акцэнтуе ўвагу на геапалітычным становішчы Беларусі на мяжы Захаду і Усходу. Сітуацыя памежжа, сутыкненне розных геапалітычных інтарэсаў абумоўліваюць сітуацыю поліэтнічнасці і поліканфесійнасці і адначасова размывання нацыянальнай ідэнтычнасці. У творах М. Гарэцкага пададзена канцэпцыя трагедыйнага лёсу беларускай нацыі, абумоўленага як геаграфічным размяшчэннем, так і неспрыяльнымі гістарычнымі ўмовамі (апавяданні “Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “На этапе”, “Хадзяка”, “Маці”, “Прысяга”, п’еса “Жартаўлівы Пісарэвіч”, аповесці “Дзве душы” і “На імперыялістычнай вайне”).

Гістарычная тэма гучыць у апавяданнях М. Гарэцкага “Князёўна”, “Войт”, “Лірныя спевы”. Празаік гаворыць пра былую веліч Беларусі і заняпад у сучасным.

У апавяданнях “Усебеларускі з’езд 1917 года”, “У 1920 годзе”, “Незадача”, аповесці “Дзве душы” М. Гарэцкі па-грамадзянску смела, аб’ектыўна ўзнаўляе тыя новыя грамадска-палітычныя ўмовы, у якіх апынулася Беларусь. Нацыянальныя інтарэсы беларусаў М. Гарэцкі выразна абараняе ў аповесці “Дзве душы”.

У творах М. Гарэцкага паказаны такі істотны працэс, як станаўленне беларуса як суб’екта гісторыі. Пісьменнік падае новы вобраз героя, мэтаскіраванага суб’екта дзеяння, прапануе новыя мадэлі паводзін. М. Гарэцкі ўздымае тэму асабістай адказнасці чалавека за свае паводзіны, намеры, адказнасць перад народам (апавяданне “Роднае карэнне”, аповесць “Дзве душы”).

Творчасць М. Гарэцкага мела выключны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры, паглыбленне яе філасофскага зместу, умацаванне яе аўтарытэту як мастацтва высокай грамадзянскасці і гуманізму.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ